***Наталля Петухова***

**МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ АМАТАРСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ**

Фарміраванне эстэтычнага ўспрымання прыроды з'яўляецца адной з найбольш складаных педагагічных задач, паспяховае ажыццяўленне якой выступае найважнейшым крытэрыем эфектыўнасці эколага-эстэтычнага выхавання, паколькі эстэтычнае перажыванне зарыентавана на прызнанне эстэтычнай выразнасці, каштоўнасці і ўнікальнасці кожнага прыроднага аб'екта і з'явы і на іх захаванне (Г.З. Апрэсян, Ю.Б. Бораў, А.1. Бураў, І.Д. Звераў, К.М. Майер-Абіх, Ю.М. Пахомаў, Л.П.Пячко, Й.Сепанмаа, І.Ф. Смальянінаў і інш.). Аналіз прац вышэйзгаданых даследчыкаў дазволіў вызначыць эстэтычнае ўспрыманне прыроды як абумоўлены эстэтычнымі патрэбнасцямі чалавека цэласны працэс адлюстравання аб'ектаў і з'яў прыроднага наваколля, які прыводзіць да пазнання і глыбокага спасціжэння іх эстэтычнай сутнасці. Пры гэтым прадметам пазнання з'яўляюцца выразныя ўласцівасці прыродных аб'ектаў, іх структура, форма, каляровыя спалучэнні, гукавыя варыяцыі, і суправаджаючыя іх эстэтычныя перажыванні, пачуцці рэцыпіента, якія выклікаюць эстэтычную патрэбнасць сузірання прыроды, каштоўнасць якой не ў карысці ці выгадзе, а ў самім факце яе існавання. Усведамленне эстэтычнай каштоўнасці прыроды сілкуе разуменне аксіяматычнай ісціны, што прыгажосць не можа быць прысвоена: спажывецкае стаўленне да прыроды амаральна, бо эстэтычныя каштоўнасці прыроды складаюць агульначалавечы здабытак і належаць не толькі нашым сучаснікам, але і будучым пакаленням.

Эстэтычнае ўспрыманне прыроды непарыўна звязана з эстэтычнымі патрэбнасцямі і інтарэсамі, ведамі асобы, яе пачуццямі і ідэаламі. З'яўляючыся элементам эстэтычнай свядомасці, эстэтычнае ўспрыманне прыроды ўтварае ўзаемаспалучэнне двух функцыянальных узроўняў: эмацыянальна- валявога (эстэтычнае сузіранне, эстэтычныя эмоцыі, эстэтычныя патрэбнасці) і інтэлектуальна- рацыянальнага (эстэтычныя ацэнкі, эстэтычныя меркаванні, эстэтычныя веды). Кіруючыся меркаваннямі псіхолагаў аб адзінстве названых узроўняў (Д.Гібсан, Л.М.Рожына, СЛ.Рубінштэйн, А.А.Мелік-Пашаеў, З.Н.Навлянская, Е.М.Таршылава, Г.В.Шэйніс і інш.), намі вылучаны наступныя структурныя кампаненты фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды: матывацыйны, эмацыянальны і кагнітыўны.

Педагагічны вопыт Г.П. Арловай, В.С Болбаса, Г.М.Волкава, Л.М. Гафаравай, С.І. Мургаевай, І.І. Ярыты і інш. сведчыць аб тым, што выключнае значэнне ў фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды мае фальклор, які пашырае кола эстэтычных уражанняў і ведаў асобы, узбагачае яе эстэтычны вопыт шляхам ўспрымання і засваення разнастайных твораў народнага мастацтва. Фальклорныя творы абуджаюць у дзяцей цікавасць да прыгожых і таямнічых поглядаў нашых продкаў на прыродны свет, скіроўваюць іх думку на засваенне эстэтычных ідэалаў народа.

На гэтых падставах вялікі інтарэс прадстаўляюць дзіцячыя аматарскія фальклорныя калектывы, удзельнікі якіх займаюцца непасрэдным вывучэннем фальклорных твораў. Дзейнасць аматарскіх фальклорных калектываў накіравана на далучэнне і засваенне аматарамі фальклорнай спадчыны Беларусі, якая змяшчае неабмежаваныя педагагічныя магчымасці для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды. Далучэнне да нацыянальнай спадчыны, да вытокаў эстэтычнай культуры пашырае досвед удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў пра духоўнае і працоўнае жыццё беларускага народа, яго светапогляд, этыку, эстэтычныя ідэалы, дазваляе асэнсаваць і ўсвядоміць іх ролю ў выпрацоўцы асабістага погляду на навакольны свет, будаўніцтве ўласных адносінаў да прыроды ў адпаведнасці законамі меры, гармоніі і прыгажосці.

Выкладзеная ніжэй методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору працягвалася з 2008 па 2010 гг. у аматарскіх фальклорных калектывах «Сунічкі» Цэнтра пазашкольнай работы «Кантакт» (г. Мінск) і «Рамонак» Цэнтра пазашкольнай работы «Маяк» (г. Мінск). Яна прадугледжвала ўдасканаленне дзейнасці калектываў і канкрэтызавалася ў вырашэнні наступных задач: узбагачэнне і пашырэнне ведаў дзяцей пра духоўнае і працоўнае жыццё беларускага народа, яго светапогляд, эстэтычныя ідэалы, знаёмства з міфалагічнымі і эстэтычнымі ўяўленнямі нашых продкаў пра прыроду, з абрадавай і святочнай культурай Беларусі, удасканаленне эстэтычнага аналізу фальклорных твораў, узбагачэнне эстэтычных уражанняў удзельнікаў у працэсе непасрэднага ўзаемадзеяння з прыродным асяроддзем, практычнае засваенне мадэлей эстэтычных паводзін у навакольным асяроддзі.

Для ўдасканалення кагнітыўнага кампанента эстэтычнага ўспрымання прыроды былі праведзены гутаркі і паведамленні, накіраваныя на паглыбленне і пашырэнне ведаў дзяцей у галіне міфалагічнага светапогляду, светаўспрымання беларусаў, якія суправаджаліся непасрэдным успрыманнем і спасціжэннем фальклорных твораў (казак, песень, легенд і інш.), аналізам іх семантыкі і мастацкіх сродкаў з пазіцыі жанравай адметнасці, ведання асноўных эстэтычных катэгорый (прыгожае - агіднае, узнёслае - нізкае, трагічнае - камічнае) і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, параўнанняў, метафар і інш., якія ўвасабляюць прыроду, фарміруюць ўяўленні пра яе прыгажосць. Успрыманне ўдзельнікамі цэласнасці і гармоніі прыроднага свету ў яго мастацкім адлюстраванні, суаднясенне мастацкага зместу з непасрэднымі жыццёвымі ўражаннямі, асабістымі назіраннямі, дапамаглі раскрыць асноўныя светапоглядныя канстанты фальклору. якія адлюстроўваюць узаемаадносіны чалавека з прыродай.

Актывізацыі эстэтычнай думкі выхаванцаў садзейнічала вывучэнне і засваенне ўдзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў шырокага кола каляндарна-абрадавых песень (і непарыўна знітаваных з імі ў побыце гульняў, рухаў, побытавых танцаў) адпаведна порам года. Гэта дазволіла прасачыць узаемасувязь народнага мастацтва з жыццём прыроды, стаўленнем чалавека да яе, актуалізаваць эмацыянальныя паралелі, шматлікія асацыяцыі і аналогіі, што спрыяла павышэнню ўзроўню эстэтычных ацэнак дзяцей, узбагачэнню эстэтычных меркаванняў, іх аргументацыі.

Эфектыўнае развіццё матывацыйнага кампаненту эстэтычнага ўспрымання прыроды адбывалася падчас арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў. Асаблівае значэнне надзялялася рэканструкцыі святаў каляндарнага цыкла ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах, што садзейнічала найбольш цэласнаму асэнсаванню дзецьмі культурнай спадчыны Беларусі і фарміраванню на яе падставе пачуцця прыналежнасці да роднага краю і роднай прыроды. Актыўнае пагружэнне у полімастацкую, сінкрэтычную дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадставіла выключную магчымасць удзельнікам фальклорных калектываў уключыцца ў абрадавую сітуацыю, перажыць яе, чым пашырыць свой уласны вопыт эстэтычнага ўзаемадзеяння з рэальнымі аб'ектамі і з'явамі прыроды.

Абавязковай умовай удзелу ў такіх мерапрыемствах было наяўнасць у рэпертуары калектыва спецыяльна-прымеркаванага да кожнага свята музычнага і танцавальна-гульнёвага матэрыялу. Мэтанакіраванае вывучэнне дзецьмі разнастайных твораў народнага мастацтва, дапасаваных да пэўнага каляндарна-абрадавага свята дазволіла шляхам пераносу, праз параўнальна-супастаўляльныя характарыстыкі, раскрыць узаемасувязь народнага мастацтва з жыццём прыроды, стаўленнем чалавека да яе, актуалізаваць сінхранічныя паралелі, спасцігнуць эстэтычную блізкасць розных фальклорных твораў. Фальклорныя творы захапілі ўдзельнікаў, абудзілі ў іх пачуццё прыгажосці прыроды, гармоніі, эстэтычнай асалоды і імкненне дзейнічаць адпаведна эстэтычным нормам.

Сістэматызацыя і абагульненне набытага вопыту на рэпетыцыях паказала, што асаблівы інтарэс у дзяцей выклікалі святы: «Каляда, каляда, дай, баба, пірага» (Беларускія дзяржаўныя музеі імя Я. Купалы і імя Я. Коласа г. Мінска), «Гуканне вясны» (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага г.Мінска), «Юр'я» (Цэнтральны Батанічны сад г. Мінска), «Зялёныя святкі» (Цэнтральны дзіцячы парк імя М.Горкага г. Мінска), «Купалле» (Батанічны сад м. Варчыно ў Польшчы).

Для развіцця эмацыянальнага кампанента эстэтычнага ўспрымання прыроды выкарыстоўвалася адна з распаўсюджаных формаў арганізацыі эстэтычнай дзейнасці - экскурсіі. Аб'ектамі экскурсійнай дзейнасці з'яўляліся як прыродныя так і культурныя помнікі, ландшафты, дзе культура і прырода ўтвараюць непарыўнае адзінства. Удзельнікі аматарскіх фальклорных калектываў падчас эксперыментальнай працы наведалі святую крыніцу г. Мінска ў мікрараёне Вяснянка, Беларуси дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Строчыца), адукацыйна-экалагічную сцежку пры палацава-паркавым комплексе ў м. Варчыно (Польшча). Падчас правядзення экскурсій дзецям было прапанавана знайсці ў жывой прыродзе пэўныя з'явы і ўласцівасці, якія адлюстраваны ў разгледжаных і развучаных на мінулых занятках творах фальклору. Непасрэднае ўспрыманне прыродных аб'ектаў, а таксама іх суаднясенне з мастацкімі выявамі прыроды, іх ацэнка як крыніцы глыбокіх эстэтычных перажыванняў і пачуццяў чалавека, садзейнічала актывізацыі эстэтычнай думкі ўдзельнікаў, узбагачэнню іх уласных эмацыянальных сувязей з прыродным асяроддзем.

Такім чынам, выкарыстаная намі методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў накіравана на развіццё эмацыянальнага (узбагачэнне эстэтычных уражанняў падлеткаў у працэсе непасрэднага ўзаемадзеяння з прыродным асяроддзем), кагнітыўнага (укараненне ў змест выхаваўчай дзейнасці калектываў канкрэтных ведаў па эстэтычнаму светаўспрыманню нашых продкаў) і матывацыйнага (павышэнне культуры ўзаемаадносінаў з прыродным асяроддзем у адпаведнасці з эстэтычнымі і экалагічнымі матывамі праз практычнае засваенне мадэлей эстэтычных паводзін у навакольным асяроддзі) кампанентаў эстэтычнага ўспрымання прыроды. Яна будуецца на спалучэнні выхаваўчых магчымасцей эстэтычнага ўспрымання і засваення фальклорных адзінак (песень, танцаў, карагодаў і інш.) з пазнаннем гуманістычных і эстэтычных поглядаў нашых продкаў на прыроду. У яе аснове - камбінаванне атрыманых на занятках ведаў, уменняў і навыкаў - з камунікатыўнымі і рэкрэатыўнымі момантамі жыцёвых сітуацый. Арганізацыя рэкрэацыі дзяцей сродкамі фальклору ў натуральным ландшафце, рэканструкцыя каляндарных абрадаў у натуральным прыродным асяроддзі, наведванне інтэрактыўных экскурсій музеяў-скансэнаў - усё гэта база фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды і культуры адносінаў да яе як да эстэтычнай і грамадскай каштоўнасці. На наш погляд, методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі аматарскага фальклорнага калектыву з'яўляецца досыць універсальнай і можа паспяхова выкарыстоўвацца ў любым аматарскім фальклорным калектыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ